[26] Тамсама, с. 44.
[27] Тамсама, с. 95.
[28] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 1, спр. 281, с. 99.
[29] Тамсама, спр. 1266, с. 19.
[30] Тамсама, с. 17.

Т.А. Самайлюк, Н.Я. Верас

## ВЫДАННІ БЕРАСЦЕЙСКІХ ДРУКАРНЯЎ XVI ст.

У другой палове XVI ст. кнігавыдавецкая дзейнасць на Беларусі развіваецца ў рэчышчы рэфармацыйнага руху. Усяго на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ў 60-90-я гг. XVI ст. было створана і дзейнічала восем пратэстанцкіх друкарняў: па адной у Бярэсці, Нясвіжы, Цяпіне, Лоску і чатыры ў Вільні – кальвінісцкага збору, С. і У.Сульцжэраў, М.Пяткевіча і Я. і Ю.Карцанаў, якая побач з пратэстанцкай літаратурай выдавала і контррэфармацыйную. Першай на сучаснай тэрыторыі Беларусі лічыцца друкарня ў Бярэсці, заснаваная ў 1553 г. вядомым кракаўскім літаратарам Бернардам Ваявудкам (1553-1554). Ініцыятарам яе стварэння быў віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Чорны. Пасля трагічнай гібелі Б.Ваявудкі ў 1554 г. М.Радзівіл Чорны заснаваў новую друкарню, якую ў 1558-1561 (?) гг. узначальваў Станіслаў Мурэліус. а ў 1561-1570 (?) гг. Цыпрыян Базылік.

Да цяперашняга часу дзейнасць гэтых друкарняў застаецца мала даследаванай у беларускім кнігазнаўстве. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што "...польскамоўным выданням берасцейскай і іншых друкарняў адмаўлялі нават у частковай прыналежнасці да беларускай культуры, што з`яўляецца як найменей абсурдным"[1]. Доўгі час кнігі, выдадзеныя лацінкай, лічыліся здабыткам польскай ці літоўскай культур і практычна былі страчаны для беларускага кнігадрукавання. Да сённяшняга дня ўвогуле вывучэнне кніг лацінскага шрыфту яшчэ не стала аб`ектам шырокага навуковага даследавання ў айчынным кнігазнаўстве.

Эфектыўнасць даследаванняў у значнай ступені залежыць ад рэпрэзентатыўнасці прадстаўленага ў бібліяграфічных крыніцах рэпертуару выдавецкай прадукцыі друкарняў, а таксама ад паўнаты звестак аб знаходжанні экземпляраў выданняў у фондах кнігасховішч. У Беларусі вельмі мала даведнікаў, якія б досыць поўна адлюстроўвалі беларускія кнігі, выдадзеныя на замежных мовах на працягу XVI ст. Такой спробай быў бібліяграфічны дапаможнік М.Васілеўскай "Беларусь у друку XVI ст."[2]. Але ён мае свае недахопы і патрабуе значнай дапрацоўкі і перавыдання. Сёння актуальнай застаецца праблема складання поўнага рэпертуару ўсёй друкаванай прадукцыі, што выходзіла на Беларусі ў яе гістарычных межах. З

гэтай мэтай Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) пачала працу па стварэнні ў аўтаматызаваным рэжыме зводнага каталога "Кніга Беларусі", які адлюстроўвае выданні XVI - XVIII стст. на замежных мовах[3]. У бібліятэках Беларусі захоўваецца не шмат асобнікаў берасцейскіх друкарняў. Апісанне экземпляраў, якія знаходзяцца ў НББ, дадзена ў публікацыі Г.У.Кірэеевай[4].

Найбольш поўна выданні берасцейскіх друкарняў прадстаўлены ў польскіх бібліяграфічных крыніцах. У першую чаргу ў "Bibliografii polskaj" К.Эстрэйхера[5]. Пэўную інфармацыю можна атрымаць з дапаможніка "Bibliografia Literatury Polskiej"[6]. Выданні берасцейскіх друкарняў з фондаў польскіх бібліятэк улічаны ў серыі каталогаў і бібліяграфічных даведнікаў "Палоніка"[7]. Кнігі, якія захаваліся ў бібліятэцы Віленскага універсітэта, адлюстраваны ў каталогу выставы "Early books of Lithuania: XVI - XVIII century"[8].

У беларускай гістарыяграфіі няма грунтоўных прац аб дзейнасці пратэстанцкіх друкарняў Бярэсця. Намі вылучаны некалькі публікацый, у якіх асветлены асобныя напрамкі дзейнасці гэтых устаноў. У доктарскай дысертацыі М.В.Нікалаева дзейнасць друкарні разглядаецца ў агульным кантэксце развіцця кніжнай культуры Вялікага княства Літоўскага, але, на жаль, з прыкрымі памылкамі[9]. У публікацыі І.Е.Еўжэнка разглядаецца прадукцыя берасцейскіх друкарняў, якая паўплывала на распаўсюджванне рэфармацыйных ідэй сярод жыхароў Беларусі і Літвы[10]. Л.Іванова таксама разглядае друкі Бярэсця з пункту гледжання іх адносін да рэфармацыйнага руху Вялікага княства Літоўскага[11]. Я.Парэцкі аналізуе антыкаталіцкія творы пратэстанцкіх друкарняў[12]. І.Саверчанка разглядае берасцейскія выданні ў аспекце распрацоўкі сацыяльнай дактрыны пісьменнікамі і філосафамі Беларусі ў XVI ст.[13] Ю.Лабынцаў адзін з раздзелаў манаграфіі "Пачатае Скарынам" прысвяціў аналізу асобных напрамкаў дзейнасці пратэстанцкіх друкароў Б.Ваявудкі, С.Мурмэліуса, Ц.Базыліка, кальвінізму і звязанай з ім праграмна-выдавецкай палітыцы віленскага ваяводы М.Радзівіла Чорнага[14].

Найбольш поўна дзейнасць берасцейскіх друкарняў распрацавана ў польскай гістарыяграфіі. Па-першае, гэта публікацыі дакументальных крыніц у XIX - пачатку XX ст.[15] Агульныя працы па гісторыі рэфармацыйнага руху і кнігадрукавання ў Польшчы і Вялікім княстве Літоўскім прадстаўлены шырока вядомымі творамі І.Гофмана, Ю.Бандтке, І.Лелевеля, К.Пякарскага, А.Кавецкай-Грычовай, М.Тапольскай, даведнікам "Друкары старадаўняй Польшчы" і інш.[16] Даследаванню аб жыцці і дзейнасці Б.Ваявудкі, С.Мурмэліуса, Ц.Базыліка прысвечаны публікацыі В.Вянгерскага, А.Вянгерскага, Ф.Пуласкага, Ю.Пташніка, А.Кавецкай-Грычовай, К.Пякарскага, С.Кота і інш.[17]

Выдавецкая палітыка берасцейскіх друкарняў залежала ў першую чаргу ад мэт распаўсюджвання пратэстантызму сярод шырокага кола насельніцтва Вялікага княства Літоўскага. Таму ў асноўным тут друкавалася рэлігійная літаратура: біблійная, катэхізічная, палемічная і г.д.

Б.Ваявудка пачаў сваю дзейнасць з выдання перакладзенага ім з лацінскай на польскую мову сачынення Крыштафа Імлера "Сумарыуш дзесяці запаветаў Божых..." (1553) - твора катэхізічнага тыпу. Самім Б.Ваявудкам складзены і выдадзены ў 1553 г. Вялікі і малы катэхізіс. Для працы над ім былі прыцягнуты творы сябра М.Лютэра Урбана Рэгіуса. Нарэшце, Б.Ваявудка пераклаў з лаціны і катэхізіс самаго У.Рэгіуса "Некаторыя спосабы і звычаі... Размовы аб значных месцах хрысціянскай навукі", які быў выдадзены ў 1554 г. Друкі Б.Ваявудкі насілі лютэранскі характар. Пасля прыняцця ў 1557 г. Мікалаем Радзівілам Чорным кальвінізму зменьваецца характар кніжнай прадукцы[18]. Першы на ўсходнеславянскіх землях арыгінальны кальвінісцкі катэхізіс быў створаны арганізатарам віленскага збору Сымонам Закам. Яго катэхізіс пад тытулам "Рэгулы" выдадзены ў 1559 г. С.Мурмэліусам у складзе зборніка "Акты ці справы віленскага хрысціянскага збора, якія пачаліся ў 1557 г..."[19].

Шэдэўрам Берасцейскага кнігадрукавання з'яўляецца так званая Брэсцкая, ці Радзівілаўская Біблія. Вялікая памерам кніга, 738 старонак, добра аздобленая, яна была разлічана на густ багатага магната[20]. Над польскім перакладам з яўрэйскай, грэчаскай і лацінскай моў працавала нямала літаратурных славутасцей - у іх ліку, Ян Ласкі, Г.Оршак, Я.Любэльчык, С.Зак і інш.[21] Гэта было першае пратэстанцкае выданне Бібліі. У прадмове да яе выказваліся не толькі кальвінісцкія ідэі, але і антытрынітарскія. Таму каталікі і пратэстанты адносіліся да яе з недаверам[22].

Вялікімі тыражамі друкаваліся і псалтыры. Напрыклад, у 1564 г. С.Мурмэліусам выдадзена Кніга псалмоў Давыдавых.

Выдаваліся ў Бярэсці і тлумачэнні да біблійных тэкстаў. Так, у 1566 г. надрукаваны кнігі Тамаша Фальконіюса "Sprawy y słowy Jezusa Krystusa..." і "Wthore księgi Lukasza swiętego...". Гэтыя працы зрабілі велізарны ўплыў на ўсю экзэгетычную традыцыю Вялікага княства Літоўскага[23].

Музычнае мастацтва пратэстанцкай традыцыі распаўсюджвалася дзякуючы канцыяналам - першым на Беларусі нотадрукам. Самым ранні з іх быў "Берасцейскі канцыянал", складзены Янам Зарэмбай. У зборнік увайшлі песні, напісаныя Ц.Базылікам і Вацлавам з Шамотул. Канцыянал складаўся з малітваў, дыдактычных песнапенняў, у якіх адлюстроўвалася як евангельская тэматыка, так і свецкая (аб каханні, радасцях і асалодах жыцця)[24].

Значную частку кніг, выдадзенных у Бярэсці, займаюць рэлігійна-палемічныя творы ў форме трактатаў, лістоў, пропаведзей, дыялогаў. Цікавым помнікам рэлігійнай палемікі XVI ст. з`яўляюцца два лісты, надрукаваныя ў Бярэсці ў 1559 г. - нунцыя папскага Алаіза Ліпамана да ваяводы віленскага Мікалая Радзівіла Чорнага ад 21.02.1556 г. і адказ Радзівіла ад 01.09.1556 г. (Rej M. Dwa listy na Polski język własnie wyłożîne, 1559). Ó ім выказваюцца погляды пратэстантаў на такія пытанні, як пасты, меса, улада папы над царквою, народная мова ў літургіі, царкоўны рытуал і інш.[25]

Частку кніжнай прадукцыі Бярэсця займалі юрыдычныя творы. Сярод іх можна назваць "Ustaw prawa polskiego" (1559/60), "Statuty sejmu Warszawskiego 1557 г." (1561) у апрацоўцы Яна Палчоўскага, а таксама збор прац Б.Граіцкага "Artykuly prawa magdeburskiego" і "Postępak sądów" (1560).

У Бярэсці было выдадзена і некалькі гісторыка-прапагандысцкіх брашур антыкаталіцкага зместу, напрыклад, "Гісторыя пра Папу Яна VIII, які аказаўся жанчынай па імені Жыльберта" (1560). У 1564 г. з-пад прэса выходзіць сатырычная паэма на польскай мове "Пратэй, або Пярэварацень", а праз год – "Размова паляка з літвінам", якая прыпісваецца пяру вядомага літаратара Аўгуста Ратундуса, які быў на той час віленскім войтам. Твор носіць публіцыстычны характар і накіраваны супраць палітычных тэорый С.Ажахоўскага, які прапаноўваў сваю мадэль канчатковай уніі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, што не выклікала захаплення ў прадстаўнікоў апошняга[26].

На працягу стагоддзяў выданні берасцейскіх друкарняў мелі вялікае практычнае значэнне як для пратэстантаў, так і для праваслаўных жыхароў. Нярэдка пратэстанцкія біблійныя тэксты выкарыстоўваліся для службы ў праваслаўнай царкве[27].

Дзейнасць берасцейскіх друкарняў XVI ст. - адна з яркіх старонак у гісторыі кнігавыдавецкай дзейнасці Беларусі. Іх выдавецкая прадукцыя побач з друкамі Мамонічаў, Я.Карцана, С.Буднага з`яўляецца неад`емнай часткай кніжнай культуры Беларусі.

[1] Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: Бел. друк. літ. эпохі Рэнесансу. - Мн., 1990. - С.167.
[2] Белоруссия в печати XVI ст.: Библиогр. указ. на иностр. яз. / ГБ БССР; Сост. М.Василевская. - Мн., 1985.
[3] Киреева Г.В. Брестские издания XVI века в фондах Национальной библиотеки Беларуси // Здабыткі: Дакументальныя помнікі на Беларусі. - Мн., 1995. - С.25.
[4] Тамсама, с. 24-29.
[5] Estreicher K. Bibliografia Polska .- Kraków; Warszawa, 1891 - 1951.
[6] Bibliografia Literatury Polskiej: Pismiennistwo staropolskie / Oprac: K.Polak. - B.m.: Panstwowy in-t wydawniczy, 1964. - T.2.
[7] Werzbowski T. Bibliografia Polonica XV ac XVI ss. I-III. - W-wa, 1889-1894; Katalog Biblioteki Kórnickiej. T 1: Polonica XVI-go wieku, cz. 1. / Zestawił K.Piekarski. - B.m.: Nakl. Bibl. Kórnickiej, 1929. - 229 s.; Dobrzynska-Rybicka L., Koehlerowna A. Katalog



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

druków polskich XVI w. Znojdujacych sie w Bibliotece Towarzystwa Przyjaciól Nauk w Poznaniu. - Poznan, 1929; Formanowicz X.L. Katalog druków polskich XVI wieku Biblioteki Kapitulnej w Gnieznie. - Poznan, 1930; Katalog Biblioteki Horniecklej XX Poninskich. Cz 1: Inkunabuly i polonica XVI w. / Zestawili A.Kawecka-Gryczowa, K.Piekarski. - W-wa, 1935; Katalog starych droków Biblioteki publicznej m.st.Warszawy. Cz.II: Polonica XVI wieku / Oprac. A.Kawecka-Gryczowa. - W-wa, 1957. - N 10, 13, 110; Budzyk K. Bibliografia dziel prawniczych Bartlomieja Groickiego - wiek XVI // Studia nad ksiazka poswiecone pamieci Kazimierza Piekarskiego. - Wroclaw, 1951. – S. 123-197; Cubertowicz J., Kowalewicz H. Katalog druków polskich XVI wieku Biblioteki Glównej Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. - Poznan, 1963; Katalog starych droków Biblioteki Zakladu Narodowego im. Ossolinskich Polonica wieku XVI / Oprac. M.Bohonos. - Wroclaw, 1965; Ozóg J. Katalog poloników XVI w. Biblioteki Uniwersyteckiej we Wroclawiu. Katalog. Cz. 1. A-K. - Wroclaw, 1988; Katalog starych druków Biblioteki Poznanskiego Towarzystwa Przyjaciól Nauk. Polonica XVI wieku / Oprac. E.Stelmaszczyk. - Poznan, 1991.

[8] Early books of Lithuania 16th - 18th century: Exhibition catalogue / Vilnius University Library. - B.m., 1997. - 59 c.

[9] Николаев Н.В. Книжная культура Великого княжества Литовского: Автореф. дис. ... д-ра филол. наук. - СПб., 1997. - 39 с. У аўтарэфераце даты дзейнасці друкарні пазначаны як 1543-1544 і 1558-1570, а друкарамі (уладальнікамі друкарні) - Бернард Ваявудка (Мікалай Радзівіл Чорны).

[10] Евженко И.Е. Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии. - М., 1988. - С.68-89.

[11] Іванова Л. З гісторыі рэфармацыйнага кнігадрукавання ў Беларусі (другая палова XVI - першая палова XVII ст.) // 480 год беларускага кнігадрукавання: Матэрыялы трэціх Скарынаўскіх чытанняў. - Мн.: Бел. навука, 1998. - С.187-189. - (Беларусіка=Albaruthenica; Кн.9).

[12] Парэцкі Я. Антырэлігійная сатыра Брэсцкага друкарскага двара ў XVI ст. // Бел. літ. - 1979. - №7. - С.177-187.

[13] Саверчанка І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. - Мн.: Тэхналогія, 1998. - 319 с.

[14] Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: Бел. друк. літ. эпохі Рэнесансу. - Мн.: Маст. літ., 1990. - 333 с.

[15] Stanislai Hosii. Epistolae tum etiam eius orationes, legationes /Ed. Fr. Hipler, V. Zakrewski. T.1-II. - Cracoviae, 1879-1886. (Acta historica res gestas Poloniae illustrantia; 4, 9); Wierbowski T. Materialy do dziejów pismiennictwa polskiego i biografii pisarzów polskich. T.1-II. - W-wa, 1900-1904; Ptasnik J. Cracovia impressorum XV et XVI ss. - Leopoli, 1922. (Monumenta Poloniae Typographica; 1). Rec.: Barycz H. // Reformacja w Polsce. - 1924. - III. - S.149.

[16] Hoffmann J.D. De Typographiis earumque initiis et incrementis in Regno Poloniae et M.D.Lithuaniae cum variis observationibus rem literariam et typographicam utriusque gentis alique ex parte ilustrantibis. - Dantisci, 1740. - S.10; Bandtkie J.S. Historia drukarn w Królestwie Polskim i Wielkim Xiestwie Litewskim, jako i w krajach zagranicznych, w których polskie dziela wychodzily. - Kraków, 1826. - T.1. - S.55-58, 186, 255, 431-432; Lelewel J. Bibliograficznych ksiag dwoje, w których rozebrane i pomnozone zostaly dwa dziela Jerzego Samuela Bandtkie: Historia drukarn krakowskich todziez Historia Biblioteki Uniw. Jagiell. w Krakowie. - Wilno, 1823. - T.1. - S.195-196; Piekarski K. Ksiazka w Polsce XV i XVI wieku // Kultura staropolska. - Kraków, 1932. - S.352-384, асобны адбітак: Kraków, 1931; Tubaszewicz J. Dzieje kosciolów wyznania helweckiego w Litwie. - Poznan, 1843. - T.2. - S.195-196; Kawecka-Gryczewa A. Drukarstwo polskie w dobie Odrodzenia // Bibliografia literatury polskiej okresu Odrodzenia. - W-wa, 1954. - S.328-273; Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku / Oprac: A.Kawecka-Gryczewa, K. Korotajowa, W.Kraewski. - Wroclaw; Kraków, 1959. - Z.5. - Bazylik Cyprian. - S.45-52; Murmelius Stanislaw. - S.180-187; Wojewódka Bernard. S.248-255; Radziwillowska Druk. Brzesc. - S.211-214; Brzesc Litewski. - S.65-66; Topolska M.B. Ksiázka na Litwie i Bialorusi w latach 1553-1660 // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 1976. - T.21. - S.150-151; Topolska M.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Czytelnik i ksiązka w Wielkim Ksiestwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku. - Wroclaw, 1984. - 337 s.

[17] Wegierski W. Kronika zboru ewangelickiego krakowskiego. - Kraków, 1817. Адноўленнае выданне твору В.Венгерскага 1651 г.; [Wegierski A.] Systema historico-chronologicum. Freistadii [Amsterdam], 1652. - S.124; Wegierski A. Slavonia reformata. - Amsterdam, 1679. - S.124; Sandius Ch. Bibliotheca Anti-Trinitarium (Appendix do Narratio compendiosa Wiszowatego). - Freistadii, 1684. - S.217; Lubieniecki S. Historia reformationis Polonicae. - Freistadii, 1685. - S.18; Lukaszewicz J. Dzieje kosciolów wyznania helwcckiego w Litwie. - Poznan, 1843. - T.II. - S.178-179; Lukaszewicz J. Dzieje kosciolów wyznania helweckiego w dawnej Malej Polsce. - Poznan, 1853. - S.9; Balinski M., Lipinski T. Starozytna Polska pod wzgledem historycznym, jeograficznym i statystycznym opisana. - W-wa, 1886. - T.IV. - S.589; Brückner A. Mikolaj Rej: Studium krytyczne. - Kraków, 1905. - S.64; Katechizm brzeski 1553/1554 r. /Wstep i wyd. F.Pulaskiego // Collectanea Bibl. Ord. Krasinskich. - W-wa, 1908. - N1. - S.V-XXI; Pulaski F. Katechizm brzeski 1553/1554 r. // Pamietnik Literacki. - 1908. - 7. - S.320-344; Pulaski F. Wiadomosci o najdawniejszych i nieznanych drukach brzeskich 1553-1554 // Przeglad biblioteczny. - 1908. - N1. - S.121-126; Ptasnik J. Dukarze róznowiercy w Krakowie wieku XVI // Reformacja w Polsce. - 1921. - I. - S.188. Reiss J. Monogramy i akrostychy w religijnych piesniach reformacji polskiej // Reformacja w Polsce. - 1921. - I. - S.312; Ulanowski B. Jakub Przyluski i jego statut // Reformacja w Polsce. 1922. - 2. - S.250-251; Kawecka A. Koncjonaly protestanckie na Litwie w XVI w. // Reformacja w Polsce. 1926. - 4. - S.134; Jasnowski J. Mikolaj Czarny Radziwill (1515-1565) // Rosprawy Historyczne Towarzystwa Naukowego Warszawskiego. - 1939. - 22. - S.360-361; Kot S. Kanjonal brzeski Jana Zareby z 1558 r. // Reformacja w Polsce. - 1937-1939. - 9-10. - S.445; Piekarski K., Kot S. Szymon Zacjusz w Brzesciu // Reformacja w Polsce. 1937-1939. - 9-10. - S. 434--435.

[18] Евженко И.Е. Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии. - М., 1988. - С.69.

[19] Саверчанка І.В. Хрысціянскі Катэхізіс у кніжна-пісьмовай культуры ўсходніх славян эпохі Адраджэння і барока: атрыбуцыя, паэтыка, семіётыка. - Мн., 1998. - С.3.

[20] Нікалаеў М.В. Шэдэўры брэсцкай друкарні // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні. - Мн., 1989. - С.144 - 149.

[21] Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: Бел. друк. літ. эпохі Рэнесансу. - Мн., 1990. - С.174.

[22] Евженко И.Е. Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии. - М., 1988. - С. 70.

[23] Саверчанка І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. - Мн., 1998. - С.53.

[24] Дадзіёмава В.У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. - Мн.: Бел. гум. адук.-культурны цэнтр, 1994. - С.66.

[25] Іванова Л. З гісторыі рэфармацыйнага кнігадрукавання ў Беларусі (другая палова XVI - першая палова XVII ст.) // 480 год беларускага кнігадрукавання: Матэрыялы трэціх Скарынаўскіх чытанняў. - Мн., 1998. - С.188.

[26] Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: Бел. друк. літ. эпохі Рэнесансу. - Мн., 1990. - С.177.

[27] Нікалаеў М.В. Шэдэўры брэсцкай друкарні // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні. - Мн.:Навука і тэхніка, 1989. - С.144 - 149.

Л.І. Доўнар

## РЭДКІЯ МІНСКІЯ ВЫДАННІ ПА МУЗЫЦЫ XIX ст.

Нотадрукаванне ў Мінску пачалося крыху пазней кнігадрукавання, што адпавядала агульнаму працэсу развіцця выдавецкай справы ў гэтай галіне. Неабходна адзначыць, што першыя